**Лявончыкаў В.Е.**, *прафесар*

# АБ ПАДЫХОДАХ ДА ГРУПОЎКІ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ ПАТРЭБНАСЦЕЙ АСОБЫ

Гуманізацыя дзейнасці сістэмы сацыяльных камунікацый патрабуе больш паглыбленага і комплекснага вывучэння інфармацыйных патрэбнасцей (ІП) асобы. Нягледзячы на тое, што па гэтым пытанні ёсць значная колькасць публікацый, на сённяшні дзень існуюць супярэчлівыя пункты гледжання не толькі на структуру і ўзроўні ІП асобы, але нават на сутнасць апошніх.

Адны вучоныя вызначаюць «інфармацыйную патрэбнасць» з дапамогай такіх катэгорый, як «веды» ці «зносіны». Іншыя аўтары сцвярджаюць, што ІП не з'яўляецца біялагічнай якасцю чалавека, а само паняцце «інфармацыйная патрэбнасць» - абстрактнае, зборнае; яно ўзнікае пры інфармацыйным падыходзе да вывучэння духоўных патрэбнасцей асобы (камунікатыўных, пазнавальных, мнеманічных, каштоўнасна-арыентацыйных). Аднясенне ІП да ліку духоўных сведчыць аб тым, што яны маюць псіхалагічны характар і ўзнікаюць у свядомасці чалавека.

У інфармацыйнай дзейнасці сутнасць асобы мае суб'ектна-аб'ектны характар, паколькі кожны чалавек непазбежна выступае ўдзельнікам і ў вытворчасці, і ў спажыванні інфармацыі. І суб'ект, і аб'ект адрозніваюцца па мадальнасці. Вучоныя ў галіне інфармацыйных навук вылучаюць змест і аб'ём мадальнасці як прыметы. Першы характарызуецца якаснымі паказчыкамі, другі - колькаснымі. Пад зместам модуса разумеюцца суадносіны яго з канкрэтнай дэмаграфічнай і сацыяльнай групай. Існаванне і ўзаемадзеянне пакаленняў ствараюць узроставую структуру ІП. Дзіця дашкольнага ўзросту, дзіця малодшых класаў, юнак, які ўступае ў перыяд самасцвярджэння, малады чалавек, які ўжо сфарміраваўся і актыўна ўдзельнічае ў сацыяльных працэсах, дарослы чалавек, чалавек стары, які пайшоў

на пенсію, - усе яны маюць патрэбу ў «сваёй» інфармацыі пэўнага зместу і аб'ёму.

Грунтуючыся на існуючай у сацыяльнай псіхалогіі групоўцы інфармацыйных патрэбнасцей у залежнасці ад узроставай прыметы, можна вылучыць наступныя ўзроўні інфармацыйных патрэбнасцей:

1) патрэбнасці, якія адносяцца да самасцвярджэння асобы (зносіны, павага акружаючых, сацыяльны статус і яго сімвалы);

2) патрэбнасці ў самаразвіцці (навуковыя, эстэтычныя, этычныя, грамадска-палітычныя і інш.);

3) патрэбнасці ў самарэалізацыі асобы (творчая дзейнасць, барацьба за рэалізацыю ўсвядомленых ідэалаў).

Па зместу модуса ў залежнасці ад асаблівасцей сацыяльнай дзейнасці асобы можна вылучыць інфармацыйныя патрэбнасці, напрыклад настаўніка, інжынера, урача і іншых.

У залежнасці ад аб'ёму модуса асоба выступае ў ролі як суб'екта, так і аб'екта інфармацыйных патрэбнасцей чатырох колькасных разрадаў - індывід, сацыяльная група, пэўнае грамадства (нацыя, дзяржава), усё чалавецтва.

Актыўную ролю ў фарміраванні інфармацыйных патрэбнасцей асобы адыгрываюць унутраныя пабуджальныя сілы: настрой, перажыванне, асаблівасці псіхалагічнага складу, матывы, устаноўкі і інш.

На ўзнікненне інфармацыйных патрэбнасцей чалавека істотны ўплыў аказваюць культурныя традыцыі канкрэтна-гістарычных супольнасцей людзей, нацыянальныя, бытавыя і іншыя ўмовы.

У залежнасці ад накіраванасці асобы на той ці іншы від дзейнасці інфармацыйныя патрэбнасці падраздзяляюцца на прафесійныя і непрафесійныя (агульнаадукацыйныя, агульнакультурныя, аматарскія і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ